Рабочы Бабруйска

22-28 чэрвеня 2000. Наклад 299 ас. Паштовы адрас: 213 807, Бабруйск, а/с 94, www.bobruisk.net. Рэдактар Ігар ХОДЗЬКА. №22

ПЕРСОНА

Ирина АНУФРИЕВА: "ПУСТЬ В ОДНО ПРЕКРАСНОЕ УТРО КАЖДЫЙ СКАЖЕТ СЕБЕ: Я — ЧЕЛОВЕК!"

С помощью этого материала я хочу познакомить читателей нашей газеты с Ириной АНУФРИЕВОЙ, председателем городского отделения Беларусской Ассоциации молодых христианских женщин (АМХЖ).

"Только ты сам можешь изменить свою жизнь!" – вот девиз этой энергичной женщины, которая стремиться объединить вокруг себя тех, кому близко подобное мироощущение.



— *Ирина, что привело вас в общественный сектор?*

— На определенном этапе своей жизни я ощутила какую-то безысходность, мне словно стало не хватать воздуха. Дети, дом, работа, работа, дом, дети... И я активно включилась в создание Беларусской Организации Трудящихся Женщин в нашем городе. Мне стало ясно, что изменить свою жизнь можно только самому. За время работы в БОТЖ пришло понимание своих стремлений; многие мои подруги нашли свою "общественную нишу". Для меня этой нишей стала Ассоциация Молодых Христианских Женщин.

— *Название организации наводит на мысль о религиозной основе вашей деятельности...*

— Название "выросло" из исторических корней. АМХЖ существует уже 100 лет, объединяя девушек и женщин в 110 странах мира. Главная идея – нести христианскую мораль в общество.

— *В первый раз я столкнулась с упоминанием о вашей организации, читая республиканскую прессу. АМХЖ активно поднимала вопросы насилия над женщинами.*

— Да, одним из главных направлений деятельности организации является работа по искоренению насилия в отношении женщин, в основном, конечно, посредством предупредительных, превентивных мер. Весь этот год Ассоциация проводила акции, направленные на информирование общества о сущности насилия. Мы помогали женщинам осознать свою ценность, найти силы и способ выхода из ситуации, когда они подвергаются насилию.

— *Вы говорите, что Ассоциация объединяет женщин из 110 стран мира. Но разве благополучная немка в состоянии понять нашу, нагруженную авоськами, женщину? У кого-то щи пустые, а у кого-то жемчуг мелкий... Разве нет?*

— Но и богатые тоже плачут. Конечно, в странах с развитой экономикой проблемы несколько отличаются от наших. Но чисто женские горести остаются одинаковыми: бьет муж; малый, по сравнению с мужским, заработок... Это касается женщин в любых странах.

— *Несколько слов о бобруйском составе организации.*

— Среди нас есть и студентки, и безработные женщины, и даже пенсионерки. В общем, все те, кто молод душой.

— *Ирина, что на ваш взгляд могло бы кардинальным образом изменить мироощущение людей?*

— Отказ от привычного страха. Осознание каждым человеком себя как личности, четко выраженное чувство собственного достоинства. Пусть в одно прекрасное утро, проснувшись, мы разучимся бояться, и каждый скажет себе: я – человек!

— *И напоследок, что вы пожелаете нашим читательницам?*

— Найти в себе силы оторваться от забот, ощутить себя милыми, желанными, любимыми. А если трудно – звоните нам по телефону 7-51-26, у нас можно получить совет юриста, психолога, просто дружеское участие.

Беседовала Надежда КОКАШ.

РЭАЛІІ

Затрымка заробкаў на прадпрыемствах

Толькі за сакавік выплацілі заробкі на Вагавым (Весовом) заводзе. Працоўным прапаноўваюць замест грошай мяса. Не лепшае становішча складаецца і на мэблевай фабрыцы імя Халтурына, на якой затрымліваюцца выплаты за май. Не суцяшае прагноз і з адпускнымі. Што прапануюць тут людзям замест грошай — невядома.

Д. Ч.

РЕГИОН

ОБСЕ поддержал. Конституционный суд вступился, дело — за прокуратурой

Могилевские правозащитники отстояли право на бесплатное использование общественными организациями и субъектами хозяйствования в своих названиях слова «Могилев».

Все началось с того, что денно и нощно радеющий за пополнение государственного бюджета Могилевский городской совет депутатов принял решение взымать пошлину за использование юридическими лицами в своих названиях слова «Могилев» и производных от него. Пошлина вводилась немаленькая: 50 минимальных зарплат – с общественных организаций, 300 «минималок» – с субъектов хозяйствования. Установленный срок расчетов – 1 июня этого года.

Могилевское отделение Беларусского Хельсинского Комитета не согласилось платить деньги за право носить имя своего города, посчитав это решение местных властей незаконным. Обратились с запросом в Консультативно-наблюдательную группу ОБСЕ. Заместитель КНГ ОБСЕ господин Х.П. Клайнер послал в Конституционный суд Республики Беларусь соответствующее обращение. Рассмотрев его, Конституционный суд пришел к выводу, что «решение Могилевского городского совета депутатов не основано на действующем законодательстве Республики Беларусь».

Воодушевленный этим ответом Могилевский правозащитный центр направил в прокуратуру заявление с просьбой опротестовать незаконное решение горсовета и обязать горисполком возвратить деньги тем, кто уже заплатил за право «могилевским зваться».

Могилевский Ледовый дворец годится для спорта, но не для культуры

Заложенный два года назад по инициативе Главного Спортсмена Всех Времен и Народов могилевский Ледовый Дворец, должен был торжественно открыться 10 июня. Строился он по-стахановски, — поскольку так быстро у нас обычно не строят, — ну а результат получился «как всегда». Причем, даже несмотря на то, что его открытие дважды переносилось на более поздние сроки.

Побывавший в новом культурно-спортивном комплексе вице-премьер белорусского правительства Геннадий Новицкий был крайне возмущен увиденным. От глаз куратора строительной отрасли республики не ушли многочисленные мелкие недоделки, оставленные строителями. Спрашивается, где европейское качество работ, которое должны были обеспечить стройматериалы мирового уровня? "Дворец не готов не только к торжественному открытию, но и к эксплуатации вообще!» — заявил вице-премьер. Новицкий потребовал устранить недостатки до 10 июня. Иначе — оргвыводы и меры воздействия на должностных лиц. А как же иначе, ведь планировалось, что в торжественном открытии Дворца культуры и спорта «Могилев» примет участие сам президент Национального олимпийского комитета, и апофеозом открытия станет хоккейный матч между его командой и сборной ветеранов хоккея Могилевщины! Негоже ведь куратору строительной отрасли «падать в грязь лицом» перед первым лицом НОКа и государства.

Между тем, кроме более-менее легко устраняемых строительных недоделок, Ледовый дворец страдает еще одним недостатком, связанным с просчетами в проекте. Дело в том, что, как единодушно отмечают уже выступавшие в культурно-спортивном комплексе в рамках фестиваля «Могилевская музыкальная весна-2000» певцы и музыканты, акустика в его зрительном зале совершенно не приспособлена для проведения музыкальных шоу, а тем более сольных концертов. «Для игр в хоккей зал, наверное, хороший, но с акустикой, конечно, большие проблемы», — признаются участники фестиваля. По-видимому, строители сделали основной упор на спортивное назначение Дворца, не учтя, что это все же культурно-спортивный комплекс. По мнению специалистов, проблемы со звуком решаемы, но для их решения необходимы дополнительные финансовые «инъекции».

P.S. *Когда данный материал готовился к печати, появилась информация о том, что официальное открытие Ледового дворца переносится на неопределенный срок.*

Анатолий САНОТЕНКО.

КРИМИНАЛ

БАТАЛЬОНУ — БАТАЛЬОНОВО, А МАММОНЕ — МАММОНОВО

Милицейский батальон внутренних войск МВД РБ был сформирован в Бобруйске в 1995 году. В его функции входит обеспечение охраны правопорядка в городе. Служить в него направляют военнослужащих-«срочников». Бобруйчане уже привыкли видеть на улицах города патрулирующих молодых солдат из дислоцированного в пригороде милицейского батальона. Служба у солдат – не сахар. Случись что-нибудь ночью в Бобруйске (ну там сумочку у женщины выхватили или сильно «приложились» к личности когонибудь из горожан), батальон тут же поднимают по тревоге и перекрывают почти весь город. И так до самого утра. А утром, без поблажек, начинается каждодневная служба – с зарядкой, пробежками, нарядами и т.д. Тяжело приходилось солдатам, но всегда был для них примером и опорой строгий, справедливый «батяня»-комбат, командир батальона, подполковник С. Швайба. А у Швайбы был хороший товарищ – начальник штаба того же батальона подполковник Л. Шкут. Такой хороший и надежный товарищ, что хоть сейчас с ним в разведку того или, по крайней мере, над стратегией и тактикой аферы какой-нибудь кумекай – ни в жизнь не продаст. И вот решили как-то два этих «настоящих» подполковника перейти «ночью у реки» Уголовный кодекс РБ. Занимаясь формированием и всяческим укреплением материальной базы вверенной им части, старшие офицеры, конечно, не отказывались от безвозмездной помощи батальону со стороны коммерческих и государственных предприятий. Тем более, что такую помощь им «благословили» и местные власти. Правда, часть получаемого для нужд батальона имущества, а это теле- и видеотехника, мебель, строительные материалы, отцы-командиры постепенно стали присваивать себе. Три года они отдавали честь «золотому тельцу». Но всему есть свое начало и свой конец.

За хищение имущества в особо крупных размерах и злоупотребление служебным положением С.Швайба и Л. Шкут осуждены Минским межгарнизонным военным судом на длительные сроки лишения свободы с конфискацией имущества. Лишили их и воинских званий. Похищенное возвращено в войсковую часть.

Анатолий ТИХОМИРОВ.



55-81-78 *Каждый четверг с 15:00 до 18:00 вас слушает «Рабочы Бабруйска»*

АСЦЯРОЖНА — ВЯРБОЎКА

ЯК МНЕ ПРАПАНАВАЛІ ЗРАБІЦЦА ПРАСТЫТУТКАЙ

Аднойчы, адкрыўшы нумар "Коммерческого курьера", на апошняй старонцы я заўважыла аб'яву такога кшталту: "Самастойны мужчына жадае пазнаёміцца з прывабнай дзяўчынай", і – нумар тэлефона. На той час я была "свабоднай птушкай у вольным палёце", ды з авантурнай жылкай. Крыху падумаўшы, я вырашыла патэлефанаваць – а можа, знайду сваё шчасце? Адказаў мне прыемны мужчынскі голас, які праявіў зацікаўленасць, прызначыўшы сустрэчу на плошчы Леніна а шостай гадзіне.

Падмаляваўшы тварык, з хваляваннем рушыла я на сустрэчу. На замоўленым месцы мяне чакаў малады мужчына гадоў каля 35-ці. Сваю размову ён пачаў з прабачэння: "Гэта знаёмыя крыху пажартавалі, змясціўшы мой тэлефон, каб жонка крыху параўнавала". Ён усміхнуўся, і сонца бліснула на залатым ланцужку, таўшчынёй з добры палец. "Аднак я не хацеў вас абражаць, таму і згадзіўся сустрэцца". Паступова размова пайшла больш вальней, мужчына праявіў шчырую зацікаўленасць маім жыццём, жахаўся, як я жыву на свой мізэрны заробак. Пагутарыўшы так колькі часу, ён прапанаваў: "А хочаш, я пазнаёмлю цябе з жанчынай, якая займаецца працаўладкаваннем у Польшчы: збор клубніц, праца на прапалцы, заробак каля 300 USD. Для мяне гэта былі вялікія грошы, і назаўтра я ўжо ўбачыла тую жанчыну. Яна нейк вяла распавядала пра сельскагаспадарчую працу ў Польшчы – а потым куды з большым імпэтам сказала: "А ведаеш, ёсць больш прыемная праца – на мяжы Польшчы і Германіі, у начным клубе". І мне, няўцямнай, пачалі – з аднаго боку ён, з другога – яна, распавядаць пра паважаную ўсімі працу прастытуткі. Слухаючы сваіх суразмоўцаў, я амаль што пераканалася, што гэтая прафесія адна з самых прэстыжных, і не кожнаму выпадае такое шчасце – папрацаваць не рукамі і не галавой.



Вось некаторыя "заманлівыя" доказы прывабнасці такой працы: "Немцы вельмі любяць беларусак, і ты знойдзеш сабе мужа", – вядома, дзе ж яго яшчэ шукаць, як не ў бардэлі? "Ты будзеш смачна есці і паліць дарагія цыгарэты", – што яшчэ патрэбна для шчасця? "Калі кліент не падабаецца, можна яго не абслугоўваць," – якая свабода выбару!

Пэўна, калі б я мела меньш крытычны погляд на жыццё, я б ужо зарабіла – па словах жанчыны – на кватэру, а на мой розум – на пажыццёвыя візіты да гінеколага. Аднак я абачліва "зрабіла ногі" і цяпер знаёмлюся больш традыцыйна.

Влада БЯРЭЗІНА.

Большая частка дзяўчын і жанчын, працуючых у сэкс-індустрыі, фактычна з'яўляюцца рабынямі. Мужчыны, якія купляюць іх, ведаюць гэта. Нявольніцтва прымаецца і эксплуатуецца гэтымі мужчынамі.

Вярбуюць жанчын шматлікімі шляхамі, уключаючы рэкламу ў газетах і на тэлебачанні. Але па дадзеных недзяржаўных арганізацый, незалежных экспертаў, абсалютная большасць дзяўчын едзе не па аб'явах фірмаў, а па запрашэннях знаёмых.

Па матэрыялах Жаночага кансультацыйна-адукацыйнага цэнтру.



Гэтая аўтазаправачная станцыя на вуліцы Крылова ўражвае сваім прыемным знешнім выглядам і высокай якасцю абслугоўвання кліентаў. Персанал тут заўсёды ўважлівы і ветлівы, сэрвіс хуткі і "беспамылковы". Такі вось астравок капіталізму ў самым лепшым сэнсе гэтага слова.

Ці дачакаецца наш Бабруйск тых часоў, калі ўсе службы горада будуць працаваць на такім высокім узроўні?.. Будзем спадзявацца.

АФІЦЫЙНА

Спадзяванні на 2 ліпеня

Днямі ў беларускай сталіцы адбылося пасяджэнне Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сіл, у якой прынялі ўдзел лідэры вядучых палітычных партый Беларусі – Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Грамадскага аб'яднання «БНФ «Адраджэнне», БСДП (Народная Грамада) і Хартыі'97.

Асноўным пытаннем пасяджэння было прызначэнне даты маючага адбыцца ў Мінску 3-га Кангрэса дэмакратычных сіл, на якім, як вядома, дэмакраты павінны выпрацаваць агульную пазіцыю адносна правядзення ўвосень парламенцкіх выбараў. У Кангрэсе прымуць удзел усе асноўныя дэмакратычныя палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі і прафесійныя саюзы.

Удзельнікі пасяджэння яшчэ раз пацвердзілі свой намер удзельнічаць у парламенцкіх выбарах толькі ў тым выпадку, калі ўлады выканаюць чатыры ўмовы: дэмакратызацыя выбарчага заканадаўства, пашырэнне ўладных функцый будучага парламента, неадкладнае спыненне палітычных рэпрэсій і допуск прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі да дзяржаўных мас-медыя.

РЭАЛІІ

Дык хто важнейшы?

Неяк мне спатрэбілася трапіць на чыгуначны вакзал – набыць білет у блізкае замежжа. Не вельмі доўгая на выгляд чарга рушылася даволі марудна, і я, не маючы ў руках чытва, прыняўся вывучаць "навакольнае асяроддзе". Увагу прыцягнуў надпіс над акенцам касіра. На першы погляд, нічога прыкметнага – нават без памылак. "Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ, інваліды і ўдзельнікі ВАВ абслугоўваюцца па за чаргой." Уразіла менавіта чарговасць у пералічэнні катэгорый людзей.

Ніхто не спрачаецца, што дэпутаты і члены розных палат і саветаў – людзі адказныя. Іх справы – самыя важныя, і марудзіць свой працоўны час стаяннем у чарзе ім няможна. Але, заўважце "зарытага сабаку": інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай узгадваюцца апошнімі! Наглядны ўзор "нерэкламнага" стаўлення ўлады да розных катэгорый сваіх грамадзян, бо, вядома, што змест гэтай шыльды быў "спушчаны" зверху.

Цікава, як будзе сябе паводзіць які-небудзь ільготны чыноўнік, калі апынецца ля касавага акенца разам з ветэранам?...

А. ЛІЦЬВІНАЎ.

СПОРТ

У чаканні галоўнага...

12 чэрвеня ў 10-м туры нацыянальнага першынства па футболу ў вышэйшай лізе бабруйская "Белшына" сустракалася ў Мінску з мясцовым "Тарпеда-МАЗам". Калі ў першай палове гульні тарпедаўцы прыглядаліся да гасцей, дык у другой, пераканаўшыся, што "Белшына" нічога небяспечнага з сябе не ўяўляе, без асаблівых цяжкасцяў разабраліся з апанентам. Па разу адзначыліся Малееў, Ярамка ды Зенін, а адзіны гол у адказ, які на пераданапошняй хвіліне са штрафнога правёў свабодны абаронца бабруйчан Эдуард Балтрушэвіч, толькі падсаладзіў горкі прысмак паразы – 1:3.

Кіраўніцтвам каманды па-ранейшаму вядзецца актыўны пошук галоўнага трэнера, але паўза ўжо зацягнулася. Відавочна, што стаўка на хуткую адстаўку з'явілася авантурным крокам, наступствы якога могуць быць непрадказальнымі па сваіх выніках.

З 14-ю ачкамі "Белшына" "завісла" на дзявятым месцы. У далёкі адрыў пайшла мазырская "Славія" – 26 ачкоў. "Нёман-Белкард" (Гродна), "Дынама" (Мінск) і "Шахцёр" (Салігорск), маючы на сваіх рахунках па 20 ачкоў, дзеляць паміж сабой 2–4 месцы.

НАРАДЖЭННЕ

Сабачае свята

У Бабруйску заснавана гарадское грамадскае аб'яднанне аматараў сабак. Працэс яго рэгістрацыі знаходзіцца ўжо ў стадыі завяршэння. Аб'яднанне плануе займацца абаронай чацвераногіх ад жорсткага абыходжання ды лабіраваннем інтарэсаў уладальнікаў сабак. Першым крокам зарэгістраванага аб'яднання, па задуме яго арганізатараў, будзе зварот у гарвыканкам з просьбай абсталяваць у горадзе пляцоўкі для выгулу сабак. Плануецца таксама наладзіць кантакты са СМІ, арганізаваць кансультацыі кінолагаў ды працу з моладзю. У далёкай перспектыве – стварэнне прытулка для бадзяжных сабак. Аднак, гэту праблему на адным энтузіязме не вырашыш – неабходны сродкі...

Кантактны тэлефон для тых, хто хоча далучыцца да новастворанага аб'яднання, ці мае намер атрымаць дадатковую інфармацыю – **2-92-36**.

Віктар КАЧАН.